**Герасімовіч А. І.**

*Дзяржауная установа адукацыі «Сярэдняя школа № 8 г. Жодзіна», г. Жодзіна, Рэспубліка Беларусь*

# ФАРМІРАВАННЕ КАМПЕТЭНЦЫЙ У ГАЛІНЕ ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЯ СРОДКАМІ ПРАДМЕТА «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»

Неабходнай і важнай перадумовай фарміравання у вучняу кампетэнцый у галіне рэсурса- і энергазберажэння з'уляецца *авалоданне* імі *пэуными тэрмінамі і паняццямі*. Для гэтага на уроках беларускай мовы неабходна паслядоуна і сістэматычна узбагачаць слоунікавы запас школьнікау словамі тэматычнай групы «Энергазберажэнне, экалогія», выкарыстоуваючы наступныя прыёмы: выяуленне слова у кантэксце, тлумачэнне яго значэння з выкарыстаннем сучасных слоунікау, складанне з новым словам словазлучэнняу і сказау; наладжванне самастойнай індывідуальнай, парнай, групавой работы вучняу па стварэнні тэматычнага слоуніка.

*Тэкстацэнтрычны падыход* – адзін з найбольш эфектыуных сродкау фарміравання кампетэнцыі у галіне энергазберажэння на вучэбных занятках па беларускай мове. Падабраны да урока тэкст спрыяе не толькі вырашэнню задач моунай адукацыі, але і садзейнічае усведамленню вучнямі сваёй адказнасці за далейшы лес планеты, за свае паводзіны на карысць навакольнага асяроддзя.

Аналіз вучэбных дапаможнікау па беларускай мове для вучняу 5–11 класау устаноу агульнай сярэдняй адукацыі паказвае, што сярод агульнай колькасці практыкаванняу тэксты на экалагічную тэму складаюць усяго 0,7% (усяго у падручніках змешчана 2710 практыкаванняу, на экалагічную тэму – 18). Для паунацэннага выхавання у вучняу экалагічнай культуры настаунiку неабходна самастойна сістэматызаваць артыкулы друкаваных СМІ, урыукі з мастацкіх творау і г.д. Станоучы уплыу на фарміраванне экалагічнага мыслення падрастаючага пакалення варты прыкладзеных намаганняу.

На уроках беларускай мовы шмат увагі удзяляецца фарміраванню у вучняу камунікатыунай кампетэнцыі. Добра арганізаваныя *маналог, дыялог, дыскусія* на экалагічныя тэмы таксама спрыяе авалоданню вучнямі уменнямі аргументавана выкладаць свае уласныя думкі, даваць ацэнку падзеям, якія адбываюцца у грамадстве і у прыродным асяроддзі.

Настаунікі беларускай мовы з'яуляюцца носьбітамі нацыянальных традыцый, яны валодаюць шырокімі ведамі у галіне беларускага фальклору. І гэтыя веды таксама можна выкарыстоуваць для фарміравання у вучняу экалагічнага мыслення. *Прапаганда пазітыуных народных традыцый прыродакарыстання* можа паспяхова ажыццяуляцца як на уроках, так і у пазакласнай рабоце праз казкі, загадкі, прыкметы, народныя абрады, прыказкі. Напрыклад, *«Не гані каня дубцом, а гані аўсом. Кармі каня не пугай, а сенам з луга»* .

Далейшае развіццё эканомікі, навукі, культуры, а таксама адукацыі не можа ажыццяуляцца без уліку наступстваy уздзеяння чалавека на прыроду. Настаунікі беларускай мовы сродкамі свайго прадмета садзейнічаюць станауленню асобы, для якой энергазберажэнне азначае не толькі эканомію энергетычных рэсурсау, але з'яуляецца вобразам мыслення і стылем жыцця, а прырода успрымаецца кожным як універсальная каштоунасць.

*Gerasimovich O. I.*

## THE FORMATION OF THE COMPETENCES IN THE SPHERE OF ENERGY SAVING BY MEANS OF THE SUBJECT "THE BELARUSIAN LANGUAGE"

The article presents the main methods of formation of pupils' ecological thinkingat the lessons of the Belarusian language.